(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

УДК 821.161.3.0(043)

ДРАБЕНЯ

Фёдар Валянцінавіч

# БЕЛАРУСКАЯ ДРАМАТУРГІЯ КАНЦА XX – ПАЧАТКУ XXI СТАГОДДЗЯЎ: ЖАНРАВА-СТЫЛЁВЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ

Аўтарэферат дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук
па спецыяльнасці 10.01.01 – беларуская літаратура

~~Мінск, 2007~~

# (ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

Работа выканана ў Беларускім дзяржаўным універсітэце

Навуковы кіраўнік — Сінькова Людміла Дзмітрыеўна, доктар філалагічных навук, прафесар, прафесар кафедры беларускай літаратуры і культуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта

Афіцыйныя апаненты: Штэйнер Іван Фёдаравіч, доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры беларускай літаратуры УА "Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны"

Садаўнічы Эдуард Васільевіч, кандыдат філалагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры беларускай філалогіі УА "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў"

Апаніруючая арганізацыя — УА "Мазырскі дзяржаўны педагагічны універсітэт І.Шамякіна"

Абарона адбудзецца 18 мая 2007 года ў 14.00 гадзін на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.01.12 пры Беларускім дзяржаўным універсітэце (220030, г. Мінск, вул. К. Маркса, 31, філалагічны факультэт, аўд. 62; тэл. вучонага сакратара: 227-61-40)

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Фундаментальнай бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага універсітэта

Аўтарэферат разасланы 14 красавіка 2007 года

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый — Хмяльніцкі М. М.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь працы з буйнымі навуковымі праграмамі і тэмамі**

Дысертацыя "Беларуская драматургія канца XX – пачатку XXI стагоддзяў.: жанрава-стылёвыя тэндэнцыі", тэма якой была зацверджана на пасяджэнні Вучонага савета філалагічнага факультэта БДУ (пратакол №3 ад 29 студзеня 2004) і ўдакладнена рашэннем Вучонага савета філалагічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта (пратакол № 7 ад 20.06.2006 г), выконвалася ў адпаведнасці з планавымі навуковымі тэмамі кафедры беларускай літаратуры і культуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта "Дынаміка беларускага літаратурнага працэсу XX стагоддзя" (2001–2005 гг., дзяржаўны рэгістрацыйны № 201), "Канцэптуальныя асновы беларускай літаратуры XX стагоддзя як цэласнага гісторыка-культурнага перыяду" (2003–2005 гг., дзяржаўны рэгістрацыйны № д/р 20011936, ф №615/96).

**Мэта і задачы даследавання**

Мэта дысертацыйнага даследавання – вызначыць жанрава-стылёвую спецыфіку драматургічных тэкстаў канца XX – пачатку XXI стагоддзяў і сістэматызаваць іх з наступным вылучэннем вядучых жанрава-стылёвых тэндэнцый у развіцці сучаснай беларускай драматургіі.

Адбор мастацкіх твораў для дысертацыйнага даследавання вызначаўся наступнымі прынцыпамі: выбіраць тэксты з улікам найперш іх *характэрнасці* для драматургіі даследуемага перыяду (г.зн. надаваць прыярытэтнае значэнне тэкстам з прыкметамі тыпалагічных сыходжанняў, падабенстваў у мастацкіх структурах); браць пад увагу *заканамернасць* з'яўлення тых ці іншых тэкстаў у сучаснай беларускай драматургіі (што, як правіла, абумоўлена сувяззю з нацыянальнай традыцыяй або выразна выяўленым іншакультурным уплывам); улічваць *рэпрэзентатыўнасць* аналізуемых твораў адносна айчыннага культурнага кантэксту (з увагай і да адзінкавых арыгінальных з'яў, і, у асноўным, пераважна, да тых твораў, наяўнасць якіх дае падставы для вылучэння відавочных жанрава-стылёвых тэндэнцый у сучаснай беларускай драматургіі).

Для рэалізацыі заяўленай мэты ў рабоце ставяцца і вырашаюцца наступныя **задачы**:

- сфарміраваць рэпрэзентатыўны корпус драматургічных мастацкіх тэкстаў з улікам разнастайнасці рэалізацыі ў іх ідэй, мастацкіх форм, а таксама статусу ў літаратурным працэсе даследуемага перыяду;
- вылучыць у сюжэтах сучаснай беларускай драматургіі вядучыя мастацкія матывы і калізіі, якія забяспечваюць тыпалагічныя сыходжанні драматургічных тэкстаў на ўзроўні іх архітэктонікі;
- на аснове аналізу сутнасных рыс, характэрных для рознажанравых і

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

рознастылёвых драматургічных тэкстаў, выпрацаваць эфектыўныя падыходы да сістэматызацыі сучасных драматургічных твораў;

— вызначыць і навукова абгрунтаваць вядучыя жанрава-стылёвыя тэндэнцыі ў развіцці беларускай драматургіі канца XX – пачатку XXI стагоддзяў.

Аб'ект даследавання – тэндэнцыі арыгінальнага засваення жанравых канонаў драмы, трагедыі, камедыі, трагікамедыі, малых драматургічных форм, а таксама паэтыкі мадэрнісцкага і постмадэрнісцкага тэатра ў беларускім літаратурным працэсе канца XX – пачатку XXI стагоддзяў.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону**

1. Традыцыйная архітэктоніка драмы, трагедыі, камедыі трывала засвоена сучаснымі беларускімі драматургамі і з'яўляецца асновай пераважнай большасці сучасных п'ес; аднак разам з гэтым традыцыйныя сюжэтна-кампазіцыйныя і жанрава-стылёвыя структуры, распрацаваная ў беларускай драматургіі найперш Я. Купалам, Ф. Аляхновічам, К. Крапівой, А. Макаёнкам, арыгінальна перайначваюцца і мадыфікуюцца шэрагам сучасных аўтараў. Усё больш распаўсюджанымі робяцца такія папулярныя ў аддаленым гістарычным мінулым драматургічныя формы, як містэрыя, фарс, лубок, а таксама звязаныя з мадэрнісцкай і постмадэрнісцкай эстэтыкай еўрапейскіх літаратур XX стагоддзя п'есы-прыпавесці, містыфікацыі, дакументальна-мастацкія радыёрэпартажы, рэканструкцыі і іншыя ўзоры жанрава-памежнага стану.
2. На аснове класічных жанрава-відавых форм беларускай драматургіі вылучаецца тэндэнцыя інтэнсіўнага развіцця сучаснай гістарычнай драмы і трагедыі (прычым трагедыйны і драматычны пачаткі збліжаюцца паміж сабой); трывалыя пазіцыі займае і камедыя, заснаваная найперш на сацыяльна-бытавым канфлікце;
3. Тэндэнцыя засваення паэтыкі мадэрнісцкага і постмадэрнісцкага тэатра ў беларускай мастацкай прасторы мяжы XX–XXI стст. найбольш арыгінальна рэалізавалася ў тэкстах з рысамі тэатра абсурду, "герменеўтычнай драматургіі", дзе побач з інтэртэкстуальнасцю захоўваюцца і выразна дамінуюць нацыянальныя канцэпты, каштоўнасці беларускай культуры;
4. Надзвычай інтэнсіўна развіваюцца такія формы сучаснай драматургіі, як аднаактавая п'еса і п'еса-казка для дзяцей малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту. Актыўнае жанрава-стылёвае развіццё гэтых драматургічных форм з'яўляецца асобнай тэндэнцыяй сучаснага літаратурнага працэсу. Лепшыя з разгледжаных твораў названай тэндэнцыі вызначаюцца плённай апрацоўкай фальклорных і літаратурных сюжэтаў, наяўнасцю арыгінальных (рэалістычных, авантурных,

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)
фантастычных, звязаных з паэтыкай антыўтопій) сюжэтаў, а таксама актуальнасцю праблематыкі (экалагічнай, сацыяльнай, маральна-этычнай).

**Асабісты ўклад суіскальніка**

Дысертацыйная праца выканана самастойна, без сааўтараў, на аснове пашырэння даследчай базы за кошт увядзення новага або малавядомага фактычнага матэрыялу, звязанага з творчасцю сучасных беларускіх драматургаў, якая ў пазначаным кірунку вывучана і сістэматызавана ўпершыню.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі**

Дысертацыя ў працэсе напісання і ў поўным аб'ёме абмяркоўвалася на кафедры беларускай літаратуры і культуры (пратакол №7 ад 19.06.2006, пратакол № 3 ад 14.11.2006). Асноўныя яе палажэнні і высновы прайшлі апрабацыю на наступных ***канферэнцыях***: 1) II Міжнародная навуковая канферэнцыя "Пісьменнік – мова – стыль", прысвечаная 75-годдзю з дня нараджэння праф. Л. Шакуна (Мінск, 15–16 лістапада 2001г.); 2) Міжнародная навуковая канферэнцыя "Творчасць А. Куляшова і адукацыйна-асветніцкія праблемы сучаснасці" (Куляшоўскія чытанні), (Магілёў, 6–7 лютага 2002 г.); 3) III Міжнародная навуковая канферэнцыя "Мова – літаратура – культура", прысвечаная 120-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа (Мінск, 27–28 верасня 2002 г.); 4) Международная научная конференция "Взаимодействие литератур в мировом литературном процессе: проблемы теоретической и исторической поэтики" (Гродно, ГрДУ, 1–3 октября 2002 г.); 5) VII Рэспубліканская навуковая канферэнцыя студэнтаў і аспірантаў Беларусі (НІРС–2002), (Наваполацк, 20–21 лістапада 2002 г.); 6) Рэспубліканская навуковая канферэнцыя "Наша класіка: традыцыі, наватарства, яе сучасная інтэрпрэтацыя ў ВНУ і школе" (Брэст, 23–24 снежня 2002 г.); 7) X Рэспубліканская студэнцкая навукова-практычная канферэнцыя "Інавацыі–2003", (Мазыр, 24–25 сакавіка 2003 г.); 8) Міжнародная навуковая канферэнцыя "Слова ў культуры" (Гомель, 13–14 красавіка 2004 г.); 9) Навуковая канферэнцыя "Філалагічныя навукі: Маладыя вучоныя ў пошуку" (Мінск, 25 красавіка 2003 г.); 10) Міжнародная навуковая канферэнцыя "Пісьменнік – мова – стыль" (Мінск, 29–30 верасня 2005 г.); 11) Міжнародная навуковая канферэнцыя "Сучасная літаратура XX – пачатку XXI стагоддзя", (Мінск, 25–27 красавіка 2006 г.).

Прэмія:

Прэзідэнцкая прэмія за лепшую работу па выніках Рэспубліканскага конкурсу навуковых работ студэнтаў 2002 года па гуманітарных, сацыяльна-эканамічных, прыродазнаўчых і тэхнічных навуках (красавік 2003 г.).

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

**Апублікаванасць вынікаў**

Асноўныя вынікі дысертацыйнай работы адлюстраваны ў 16 навуковых публікацыях, напісаных без сааўтараў, сярод якіх 3 артыкулы ў навуковых часопісах, рэкамендаваных ВАК (1,5 аўтарскага аркуша), 4 артыкулы ў навуковых зборніках (1,5 аўтарскага аркуша), 9 матэрыялаў выступленняў на міжнародных, рэспубліканскіх, галіновых канферэнцыях (2,5 аўтарскага аркуша). Агульны аб'ём надрукаваных матэрыялаў – 5,5 аўтарскага аркуша.

**Структура і аб'ём дысертацыі**

Дысертацыя складаецца з уводзінаў, агульнай характарыстыкі работы, трох глаў, заключэння, спісу выкарыстаных бібліяграфічных крыніц, спісу публікацый па тэме дысертацыі і дадатку. Асноўны матэрыял дысертацыі складае 108 старонак; спіс выкарыстаных (цытаваных) крыніц займае 9 старонак і змяшчае 124 назвы, дадатак – 3 старонкі.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ

### Артыкулы ў навуковых часопісах, рэкамендаваных ВАК

1. Драбеня, Ф.В. Жанравыя асаблівасці драматургіі Сяргея Кавалёва / Ф.В. Драбеня // Весн. Беларус. дзярж. ун-та. Сер. 4, Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. – 2004. – №3. – С. 3 – 7.

2. Драбеня, Ф.В. Актуалізацыя традыцыйных жанраў у сучаснай беларускай драматургіі / Ф.В. Драбеня // Весник Полоцкого государственного университета. Серия А. Гуманитарные науки. – 2006. – №1 – С. 116-121.

3. Дробеня, Ф. В. Развитие трагического и драматического начала в сюжетах современной белорусской драматургии / Ф.В. Дробеня // Вести Института современных знаний имени А. М. Широкова. – 2006. – №1 С. 25-27.

### Артыкулы ў навуковых зборніках і альманахах

4. Драбеня, Ф.В. "Герменеўтычная драматургія" С. Кавалёва як з'ява сучаснай беларускай літаратуры / Драбеня Ф.В. // І Сборник научных работ студентов высших учебных заведений Республики Беларусь «НИРС 2002». Республиканский конкурс научных работ студентов «НИРС-2002» по гуманитарным, естественным и техническим наукам / Министерство образования Республики Беларусь, БГУ; редкол.: А.А. Баешко [и др.]. - Минск: Министерство образования, 2003. – С. 90-93.

5. Драбеня, Ф. В. Паэтыка п'есы Сяргея Кавалёва "Стомлены д'ябал" / Ф.В. Драбеня // Беларускае літаратуразнаўства / рэдкал. Л.Д. Сінькова. – Мінск, Вільня: Інстытут Беларусі ў Літве, 2004. – №2. – С. – 69 – 78.

6. Драбеня, Ф. В Мадыфікацыі жанру камедыі ў сучаснай беларускай драматургіі // Ф. В. Драбеня // Беларускае літаратуразнаўства / рэдкал. Л.Д. Сінькова. – Мінск: ВТАА "Права і эканоміка", 2004. – Вып. 1. - С. 45 – 50.

7. Драбеня, Ф. В Спецыфіка п'ес-казак для дзяцей малодшага школьнага ўзросту / Ф.В. Драбеня // Беларускае літаратуразнаўства: навук.-метад. альманах / рэдкал. Л.Д. Сінькова [і інш.] – Мінск: РІВШ, 2006. – Вып. 2. – С. 117 –126.

8. Драбеня, Ф.В Пошукі і знаходкі беларускай драматургіі ў жанры аднаактавай п'есы / Ф.В. Драбеня // Слово в культуре: сб. науч. ст. В 2 ч. – Ч. 2: Слово и текст в философии, богословии, культурологии. Художественный текст в современном научном знании. Сучасныя напрамкі літаратуразнаўства і фалькларыстыкі // под общ. ред. В.Н. Калмыкова, И.И. Морозовой. – Гомель: УО «ГГУ им. Ф. Скарыны», 2004. -С. 261 – 266.

### Матэрыялы навуковых канферэнцый

9. Драбеня, Ф.В. Стылёвыя асаблівасці п'есы С. Кавалёва "Звар'яцелы Альберт" / Ф.В. Драбеня // Пісьменнік – Мова – Стыль: матэрыялы ІІ Міжнароднай канферэнцыі, прысвечанай 75-годдзю з дня нараджэння

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

Л.М.Шакуна, Мінск, 15-16 лістапада 2001 г. / БДУ; рэдкал.: М. Р. Прыгодзіч [і інш.]. – Мінск: РІВШ, 2002.– С. 55 – 59.

10. Драбеня, Ф.В. Герменеўтыка ці рымейк? П'еса С.Кавалёва "Франціпіка, або Навука кахання" / Ф.В. Драбеня // Творчасць А.Куляшова і адукацыйна-асветніцкія праблемы сучаснасці: матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі, Магілёў, 6-7 лютага 2002 г. / МДУ імя А.А. Куляшова; рэдкал.: М.І. Мушынскі [і інш.]. – Магілёў, 2002. – С. 35 – 36.

11. Драбеня, Ф.В. Сюжэт-прататып у драме С.Кавалёва "Трышчан, або Блазны на пахаванні" / Ф.В. Драбеня // Взаимодействие литератур в мировом литературном процессе: проблема теоретической и исторической поэтики: материалы Международной научной конференции, Гродно, 1-3 октября 2002 г. / ГрГУ имени Янки Купалы; рэдкал.: Т.Е. Автухович [и др.]. – Гродно, 2002. – С. 34 – 36.

12. Драбеня, Ф.В. Сюжэты з творчасці Я. Купалы ў драме С. Кавалёва "Стомлены д'ябал" / Ф.В. Драбеня // Мова– Літаратура – Культура: матэрыялы III Міжнароднай канферэнцыі да 120-годдзя з дня нараджэння Я. Купалы і Я. Коласа, Мінск, 27-28 верасня 2002 г. / БДУ; рэдкал.: З.І. Бадзевіч [і інш.]. – У 2 т. – Мінск, 2002. – Т.1. – С. 116-119.

13. Драбеня, Ф.В. Прыём "*тэатр у тэатры*" ў драмах С. Кавалёва / Ф.В. Драбеня // "Наша класіка: традыцыі, наватарства, яе сучасная інтэрпрэтацыя ў ВНУ і школе": матэрыялы рэсп. навук. канф. 23-24 снежня 2002 г. / пад агул. рэд. М.І. Мішчанчука / – Брэст: БрДУ імя А.С. Пушкіна, 2003. – С. 38-41.

14. Драбеня, Ф.В. Драма С. Кавалёва "Стомлены д'ябал" як кантамінацыя ў беларускай літаратуры / Ф.В. Драбеня // Инновации – 2003: материалы X Республиканской студенческой науч.-практ. конф. (Мозырь 24 – 25 апреля 2003 г.). – Мозырь, 2003. – Ч. 1 – С. 141.

15. Драбеня, Ф.В. Жанравая спецыфіка драматургіі С. Кавалёва / Ф.В. Драбеня // Материалы VII республиканской научной конференции студентов и аспирантов Беларуси (НИРС – 2002), / Новополоцкий государственный университет. – Новополоцк, 2002. – Т. 2. – С. 9 – 11.

16. Драбеня, Ф.В Цытацыя ў архітэктоніцы п'есы С. Кавалёва "Звар'яцелы Альберт"/ Ф.В. Драбеня // Філалагічныя навукі: маладыя вучоныя ў пошуку: матэрыялы навук. канф. 25 красавіка 2003 г. / Беларус. дзярж. ун-т; адк. рэд. С.А. Важнік. – Мінск, 2004. – С. 238 – 241

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)


## РЭЗЮМЕ

Драбеня Фёдар Валянцінавіч

Беларуская драматургія канца XX – пачатку XXI стагоддзяў: жанрава-стылёвыя тэндэнцыі

Ключавыя словы: драматургія, камедыя, трагедыя, драма, трагікамедыя, творы жанрава-памежнага стану, "тэатр у тэатры", герменеўтычная драматургія, аднаактавая п'еса, гістарычная драма, п'еса-казка для дзяцей.

Мэта дысертацыйнага даследавання – вызначыць жанрава-стылёвую спецыфіку драматургічных тэкстаў канца XX – пачатку XXI стагоддзяў і сістэматызаваць іх з наступным вылучэннем вядучых жанрава-стылёвых тэндэнцый у развіцці сучаснай беларускай драматургіі.

Метадалогія даследавання мае комплексны характар і грунтуецца на прынцыпах гісторыка-культурнага літаратуразнаўства, сістэмна-структурнага метаду, пры гэтым улічваецца рэпрэзентатыўнасць аналізуемых тэкстаў.

У дысертацыі ўпершыню ў айчынным літаратуразнаўстве сучасная беларуская драматургія (апошняй трэці XX – пачатку XX стст.) стала прадметам цэласнага манаграфічнага вывучэння з пункту гледжання вылучэння асноўных кірункаў яе жанрава-стылёвага развіцця на падставе тэкстуальнага разгляду вялікай колькасці твораў, якія належаць практычна да ўсіх актуальных сёння драматургічных жанравых форм; упершыню грунтоўна даследавана ідэйна-эстэтычная спецыфіка рэпрэзентатыўных сюжэтаў 144 п'ес з сучаснага драматургічнага корпуса тэкстаў беларускай драмы, трагедыі, камедыі, трагікамедыі, твораў жанрава-памежнага стану, характэрных форм гістарычнай драмы, п'ес, у якіх адлюстравалася паэтыка мадэрнісцкага і постмадэрнісцкага тэатра, а таксама сучасных аднаактавых п'ес і драматургічных твораў для дзяцей у іх жанрава-стылёвай і сюжэтнай разнастайнасці; пры гэтым п'еса-казка для дзяцей (з улікам яе спецыфічнага сацыяльнага, узроставага статусу і яе шматбаковых сувязей з агульнай літаратурнай і культурнай традыцыямі) таксама ўпершыню прааналізавана ў жанрава-стылёвым аспекце. У выніку здзейснена літаратуразнаўчая атрыбуцыя дамінуючых у сучаснай беларускай драматургіі жанрава-стылёвых тэндэнцый.

Практычная значнасць атрыманых вынікаў заключаецца ў тым, што матэрыялы даследавання могуць быць выкарастаны ў далейшых даследаваннях беларускай драматургіі і тэатра XX – XXI стст., пры падрыхтоўцы лекцый і практычных заняткаў, спецкурсаў і спецсемінараў, прысвечаных заканамернасцям жанрава-стылёвага развіцця літаратурнага працэсу канца XX – пачатку XXI стагоддзяў, пры напісанні вучэбна-метадычных дапаможнікаў для ўстаноў адукацыі Рэспублікі Беларусь, адрасаваных настаўнікам, студэнтам-філолагам і старшакласнікам.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

# РЕЗЮМЕ

Дробеня Фёдор Валентинович

Белорусская драматургия конца XX – начала XXI веков: жанрово-стилевые тенденции

Ключевые слова: драматургия, комедия, трагедия, драма, трагикомедия, произведения жанрового пограничья, «театр в театре», герменевтическая драматургия, одноактная пьеса, историческая драма, пьеса-сказка для детей.

Цель диссертационного исследования – определить жанрово-стилевую специфику драматургических текстов конца XX – начала XXI веков и систематизировать их с последующим выделением ведущих жанрово-стилевых тенденций в развитии современной белорусской драматургии.

Методология исследования носит комплексный характер и основывается на принципах историко-культурного литературоведения, системно-структурного метода, при этом учитывает репрезентативность анализируемых текстов.

В диссертации впервые в отечественном литературоведении современная белорусская драматургия (последней трети XX – начала XX веков) стала предметом целостного монографического изучения с точки зрения выделения основных направлений её жанрово-стилевого развития на основе текстуального рассмотрения большого количества произведений, которые принадлежат практически ко всем актуальным сегодня драматургическим жанровым формам; впервые основательно исследована идейно-эстетическая специфика репрезентативных сюжетов 144 пьес из современного драматургического корпуса текстов белорусской драмы, трагедии, комедии, трагикомедии, произведений жанрового пограничья, характерных форм исторической драмы, пьес, в которых отображена поэтика модернистского и постмодернистского театра, а также современных одноактных пьес в их жанрово-стилевых и сюжетных разновидностях; при этом пьеса-сказка для детей (с учётом ее специфического социального, возрастного статуса и ее многогранных связей с общей литературной и культурной традицией), также впервые системно проанализирована в жанрово-стилевом аспекте. В результате получена литературоведческая атрибуция доминантных в современной белорусской драматургии жанрово-стилевых тенденций.

Практическая значимость полученных результатов заключается в том, что материалы исследования могут быть использованы в дальнейших исследованиях белорусской драматургии и театра XX – XXI веков, при подготовке лекций и практических занятий, спецкурсов и спецсеминаров, посвященных закономерностям жанрово-стилевого развития литературного процесса конца XX – начало XXI веков, при написании учебно-методических пособий и учебников для учреждений образования Республики Беларусь, адресованных учителям, студентам-филологам и старшеклассникам.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

## SUMMARY


Drobena Phyodor Valentinovich

Bylorusian Dramaturgy of the late XX – early XXI: genre-style tendencies

Key words: dramaturgy, comedy, tragedy, drama, tragicomedy, works of genre-intermediate condition, remake theatre, inside theatre, germinative dramaturgy, one-act drama, historical drama, pantomime for children.

Aim of research: to systematize dramaturugic texts of the XX – early XXI centuries on the basis of their genre-style definition; to create a representative and scientifically , based picture of development of moden Belarusian dramaturgy within the frontiers of the period investigated.

Research methodology is of a complex character. It is mainly based on the principles of historical and cultural study of literature and structural analysis of the texts, taking into account the representativeness of the analezed texts. A great deal of analyzed text has been taken into account, and it has a complex nature Scientific novelty. Belarusian dramaturgy of the late XX – early XXI has become the subject matter of intact monographic research from the point of view of emphasizing the main trends of its genre development. All the research has been carried out on the basis of textual criticizm of a large numder of works which are related to practically all present-day dramaturgic genre forms. Aesthetic peculiarities committed to philosophical principles of representative plots of 144 plays of modern dramaturgic texts of Belarusian drama, tragedy, comedy, tragicomedy, works of genre-intermediate condition have been investigated carefully for first time. This list can be continued dominant with forms of specific typical historical drama, plays reflecting the poetics of post modern theatre, as well as modern one-act plays of their and plot varieties. Modern Belarusian dramaturgy for children was first system-analyzed and classified taking into account its specific social and age status as well as its versatile ties with literary and cultural tradition. As a result predominent in modern Belarusian dramaturgy genre and style tendencies are ascribed to literature science/

Practical value of results received is that they can be used in further research of the Belarusian dramaturgy and theatre of the XX – XXI centuries, in lectures and tutorials, specialized course and seminars, in writing educational text-books for higher educational esteblishments, for colleges and scools, for future philologists and senior pupils.